Мікола Маляўка

# Дзе жывуць казкі



Мікола Маляўка

# Дзе жывуць казкі



Вершы, казкі

МІНСК
«ЮНАЦТВА»
1994

ББК 84Бел7
М21

Рэдактар выдавецтва У. КАРЫЗНА

МАСТАК С. РЫЖЫКАВА

Книга состоит из стихов и сказок, которые издавались раньше и пришлись по душе маленькому читателю, заинтересуют и новые произведения поэта, воспевающие родной край, мир, труд, дружбу ребят.

М $\frac{4803120202-014}{М\ 307(03)-94}$ 49—94

ISBN 5-7880-0559-0

© М. Маляўка, 1994
© Ілюстрацыі. С. Рыжыкава, 1994



# ДЗЕД
# І
# ЎНУЧКА





## ЮЛЯ

Колькі год —
Яна не скажа,
А без слоў руку пакажа.
Пальцы злічыш без турбот —
Скажаш,
Колькі Юлі год.

Ні сястры ў яе,
Ні брата.
Толькі мама,
Толькі тата.



Юля ў горадзе жыве,
А ў якім — не ў галаве.
Папытае хто, бывае,—
Кажа, ў тым, дзе ёсць трамваі,
Карусель, дзіцячы сад,
Эскімо і шакалад.

Юлю-госцю без білета
Цеплавоз прывёз у лета.
Тата побач быў учора,
Ды вярнуўся ён у горад.
Абяцаў: праз тыдзень недзе
Разам з мамаю прыедзе.

Рада бабка,
Рады дзед —
Весялей глядзяць на свет,
Ходзяць — не чуваць падлогі:
Спіць унучка іх з дарогі.

## ЛАСТАЎКІ



Коўдра —
Каля сценкі:
Голыя каленкі
І вальней рукам.
Госцейку маленькую
Песціць дзед Адам:
— Будзяць Юлю ластаўкі,
Будзяць на ляту.
Слухай, шчэбет ласкавы
Я перакладу:
Віць-віць,
Віць-віць —
Сонейка не спіць,
Праз акенца з Юлі
Не звядзе вачэй,
Просіць, каб на вуліцу
Выбегла хутчэй.
Віць-віць,
Віць-віць —
Бабка, глянь, не спіць,
Без цябе ўхадзілася
Ў хаце акурат.
Будзеш з бабкай Зінаю
Пасвіць куранят.
Віць-віць,
Віць-віць —
Дзед Адам не спіць,
Возьме ў лес,

Па лузе,
Полем праўдзе.
Шмат каго паслухаеш —
Дзед перакладзе...



Дык хутчэй жа плацейка,
Туфелькі надзень.
Чуеш, хваляць ластаўкі
Ясны летні дзень.

## ЗОРКА

Ля стала таўкучка,
Бабка заклапочана:
— Сырадою ўнучка
Піць зусім не хоча,
Не памочыць губак —
Адстаўляе кубак.

Па сакрэту Юлі
Шэпча дзед на вушка:
— У хляве ў Рагулі
Зорка ёсць, дачушка.
Паглядзець заве,
Як жыве ў хляве.
Адкладаць не трэба,
Занясём тады
Ты — акрайчык хлеба,
Я — вядро вады.

Цёмная, без вокан,
У каровы хатка.
Пры карове збоку
Тупае цялятка,
Як Рагуля-мама,
Чорнае таксама.
Торкнулася пыскай
У вядро...
— Не пырскай,—
Кажа дзед цялятку.—
Хлеб вазьмі спачатку.

— Мм-у...
— Кажа, не вазьму.
З мамаю Рагуляй
Малачка паслалі Юлі,
А яна не п'е.
Чаму?
— Мм-у...

— Зорка, так здараецца,
Не глядзі з дакорам.
Бачыш, Юля каецца,
Бачыш, Юлі сорам.

— Мм-у...
— Так і быць, вазьму.
Хлеб запʼю вадою.
Толькі хай і Юля
Вып'е сырадою.
З мамаю Рагуляй
Нам не будзе горка.
Вып'е?
— Вып'ю, Зорка!..

Цешыцца на кухні,
Рада бабка Зіна:
— Юля — малайчына!
Сырадою кубак
Выпіла адна,
Выпіла да дна,
Губкі аблізала.
Што з унучкай стала?
— Што? — смяецца дзед
З бабчынай гаворкі.—
Гэта не сакрэт,
Папытай у Зоркі.

## СНЯЖОК

Не пайшла гуляць
Юля ў сад з падворка.
Просіць паказаць,
Дзе жыве вавёрка.

— Я не знаю сам,—
Кажа дзед Адам.—
Папытаем, можа,
Нам Сняжок паможа.
— Гаў!.. Гаў!.. Гаў!..
— Што ён, дзед, сказаў?
— Час у лесе бавіць,
Кажа, сам бы рад.
Хто паможа бабцы
Пасвіць куранят?

Гуртам бабку Зіну
Ўгаварылі ледзь.
І адна згадзілася
Куранят глядзець.

Дзе дупло, гадае,
Лес Сняжок абег.
І перакладае
Дзед вясёлы брэх:
— Трэба ўзяць улева
Ды спусціцца з горкі —
Там і будзе дрэва
З домікам вавёркі.

Вылезла з дупла,
Бачаць, гаспадыня.
Села на галіне,
Лапку падняла —
«Добры дзень» дала.

Па галінах-кладках
Паскакала шпарка:
Як-ніяк на лапках
Дзеці, гаспадарка...

Перайшлі лажок,
Папілі з крыніцы.
Паказаў Сняжок,
Дзе растуць суніцы.



Забалелі ножкі.
Дзед падвёз бы трошкі,
Ды шкада: не мае
Лес свайго трамвая.

— Гаў!.. Гаў!.. Гаў!..
— Што ён, дзед, сказаў?
— Раіцца Сняжок,
Ці не час дахаты:

Ён жа пастушок —
Бабчын памагаты.
Як там кураняты?

Не пярэчыць Юля.
І самой дахаты
Хочацца да слёз,
Просіць, каб дзядуля
На руках паднёс.

## ЗЯЗЮЛЯ

Мёдам лес прапах, як вулей.
Дзе ён, поля беражок?
Не заблудзяць:
Дзеда з Юляй
У сяло вядзе Сняжок.
Чуюць убаку:
— Ку-ку!..
Ку-ку!..

Дзед Адам куванне зычнае
На гады́ перакладае.
А зязюля лічыць,
Лічыць,
Лічыць,
Быццам завадная.

— Ой, унучка, збіўся з ліку,
А зязюля не змаўкае.
Кажа, вырасцеш вялікай.
Толькі просьба ёсць...
— Якая?
— Просіць шэрая зязюля,

Каб сядзела меней Юля,
Каб сцяжынкамі ляснымі,
Лугавымі,
Палявымі
Падарожнічала з дзедам
Ножкамі сваімі...

Любіш ты хадзіць?
— Люблю!
— Малайчына!
Так і ведаў,—
Дзед з усмешкай Юлю хваліць,
З рук спускае на зямлю
Пад зязюльчына куванне
У беразняку:
— Ку-ку!..
Ку-ку!..

Дзякуй, добрая зязюля,
Весялей ісці нагам.
За Сняжком ступае Юля,
А за Юляй — дзед Адам.

## КУРЫЦА-НЯСУШКА

Сыпала з гарнушка
Юля проса ўранку.
Курыца-нясушка
Бегала пры ганку,
Сакатала ля акон:

— Ко-ко-ко...
Ко-ко-ко...

А цяпер дык крылы
Развіне, як птах,

І крычыць да хрыпу:
— Куд-кудах-тах-тах!..

Можа, ножку, бедная,
Падвярнула дзе?
Юля пэўна ведае:
Дзед перакладзе.

— Куд-кудах-тах-тах!..
— Кажа, недалёка
Знеслася ў кустах.
Дбае, каб сарока,
Гэтая гультайка,
Не пабіла яйка.

— Куд-кудах-тах-тах!..
— Чуем, што ў кустах,
Пры старым гумне.
Не крычы так гучна.
Дзякуй ад мяне,
Дзякуй ад унучкі.

Яйка праз хвіліну
Дзед знайшоў, канечне.
Клічуць бабку Зіну,
Каб спякла яечню.

## ПАРАСЯТКІ

Бабка поле градкі,
Рве бярозку-зелле.
Знае, парасяткі
З'елі ўсё, што мелі.

Бедненькія, можа,
Паміраюць дзесьці.
Юля з зеллем кошык
Памагае несці.



— Рох-рох-рох...
Рох-рох-рох...—
Труцца каля ног
Япручок і свінка —
Беленькая спінка,
Чорненькая спінка.

Можа, просяць ласкі?
Ці яда не ў смак?
Бабка перакласці
Не змагла ніяк.

Дзед і тут памог:
— Кажуць, любяць зелле,
А найбольш гарох —
З кошыкам бы з'елі.
Ім не трэба хлеба,
Просіць япручок,
Каб прынёс хто-небудзь
Хоць адзін стручок.

Юля ўжо гатова
Бегчы за парог:
Знае месца тое,
Дзе расце гарох.

— Рох-рох-рох...
Рох-рох-рох...
— Бачаць, дзед галодны,
Юля толькі з лесу,
Абысціся згодны
Без далікатэсу.

Юля верыць — праўда,
Знае ў хлеў дарогу,
Парасяткам заўтра
Прынясе гароху.

Зачыняе дзверы
Дзед на ноч, чуваць.
Час самім вячэраць
Ды адпачываць.

## ДЗЕ ВУЧЫЎСЯ ДЗЕД

Юля ўсё дачыста
Хоча знаць, відаць.
— Дзе ты навучыўся,
Дзед, перакладаць?
— Дзе, пытаеш?..
У падпаскі
Бралі нас даўней.
Час такі быў:
З панскай ласкі
Пасвіў я свіней.
Пугай гладзіў іх у садзе,
Адганяў ад град.
І паставілі, каб ладзіў
З чарадой цялят.
Ведаў кожны куст у лузе,
Кожны ўзгорак, роў.

Зноў павысілі па службе:
Пасвіць стаў кароў.
А сабака, мой падпасак,
Мне паказваў бор,
І звяроў з чароўных казак,
І птушыны хор.
Слухаў я, пастух-падлетак,
І тады, відаць,
Навучыўся, Юля, гэтак
Свет перакладаць...

Дзед даўжэй бы баяў
Пра далёкі час,
Ды яечню бабка
Падала якраз.

## КОТ-КАЗАЧНІК

Абдымае Юля,
Просіць шчыра так:
— Раскажы, дзядуля,
Казку пра ката.
— Кот Максім і сам
Казачнік вялікі,—
Кажа дзед Адам,
Седзячы на лыку.—
Просьбаю, як ласкай,
Дагадзі кату,
Ну, а я тым часам
Кораб дапляту.

Праўда, не ўцякае,
Бае кот Максім,
Ды ў ягонай казцы
Слоў няма зусім.
Страціўшы надзею,
Юля дзеда кліча:
— Я не разумею,
Што ён мне мурлыча.

Дзед бліжэй сядае,
Спагадае дзед
І перакладае
За катом услед:
— У мяне, ката Максіма,
Толькі торба за плячыма.
А былі сям'я, сябры,
Замак на крутой гары.
Мы зямлі абшары мелі,
Не было за нас дужэй.
Тысяч пяць, відаць, не меней,
Нам прыслужвала мышэй.
І аралі мышы ў полі.
І касілі.
І малолі.
І пяклі духмяны хлеб.
І па бульбу лезлі ў склеп.
І кароў даілі ў нас.
І смалілі кабана.
І цягнулі рыбу з лодкі.
Мышы дбалі пра харчы:
Дзень, бывала, быў кароткі,
Дык не спалі і ўначы.
Ад прысмакаў —
Булак з макам,
Паляндвіцы,
Юшкі,
Ракаў —
Аж ламаўся ў будні стол.
Мышы тупалі вакол,
Падавалі без падказкі
І катлеты, і каўбаскі.
Зналі ўсе:
За клопат гэткі
Застануцца ім аб'едкі.
Я, аднак,
Не быў лайдак:
Стрэльбу меў, каня, сабак,
У сядле пасля снядання
Гарцаваў на паляванне.
Вось аднойчы бацька кажа:
«Едзе ў госці цётка наша,
А дзічына выйшла ўся —
Асачы, Максім, лася».
Я насціг лася ў балотцы.
І за год не з'есці цётцы:
Мяса — цэлая гара!
Бачу сам — дамоў пара.
Прыязджаю з палявання —
Замак спалены дазвання,
І загінулі каты —
Бацька,
Маці,





Тры браты.
А мышэй і след прастыў.
Зналі, я пайду па пятах,
Зналі, стрэльба за плячыма —
І разбегліся па хатах
Ад мяне, ката Максіма.
Я ў дарогу зноў сабраўся,
Я над попелам пакляўся:
«Спаць не буду цэлы год,
А звяду мышыны род!»
Вось чаму адзін я, сумны,
Абыходжу хаты, гумны
І лаўлю мышэй бясплатна —
Дзякуй скажуць, то і ладна.
Не адно сяло аблётаў,
Бачыш, я сяджу без ботаў
І знасілася кашуля —
Шмат было турботаў, Юля.
Я і ў вас цяпер не госць:
Дзед казаў, што мышы ёсць...

Кораб невялікі
Дзед даплёў якраз.
Засталося лыка —
Пук як на заказ.

Дзед бярэ астачу:
— Так і быць, кату
За дабро аддзячу —
Лапцікі спляту.

Плешча ў ладкі Юля,
Кажа:
— Дзед Адам,
Я сваю кашульку
Коціку аддам!

Дзед Адам смяецца,
Задаволен дзед:
Казку ён, здаецца,
Пераклаў як след.
— Ляж, унучка,—
Просіць,—
Ды паспі даўжэй —
Казачніку босаму
Час лавіць мышэй.

## КАЛЫХАНКА

Узышоў над светам
Месяц-веташок.
Ты чаму дагэтуль
Спаць не лёг, Сняжок?



Час такі —
Заснулі
Ластаўкі,
Вавёрка
І зязюля,
Зорка
З мамаю Рагуляй,
Сакатушка
Курыца-нясушка,
Япручок і свінка —
Беленькая спінка,
Чорненькая спінка.
Час такі —
Заснулі
Бабка Зіна,
Юля,
Мама з татам,
Дзед Адам...
Час,
Сябры,
Заснуць і вам.





Над зямлёю свеціць
Месяц-веташок.
Ці спакойна ў свеце,
Слухае Сняжок.



# САЛОДКІ ЛЯДЗЯШ



## СТОЛ

Дружная сямейка:
Мама, тата, дзед,
Васілёк, Сяргейка,
Глеб і я, Міхед.

Будны дзень ці свята —
Смеху повен дом.
Толькі цеснавата
За адным сталом.

Не пайшлі мы з Глебам
Бегаць у футбол.
З дошак самых лепшых
Робім новы стол.

Вось ён, стол, памалу
Стаў на ножкі ўсе.
Дзе прапала мама?
Хай абрус нясе!

Сядзе ўся сямейка:
Мама, тата, дзед,
Васілёк, Сяргейка,
Глеб і я, Міхед.

## САЛОДКІ ЛЯДЗЯШ

Днём мароз хаваўся ў цень.
Шчабяталі птушкі,
Шчабяталі
Цэлы дзень
Ручаінкі-весялушкі.

Хто пакрыўдзіў клёнік наш?
Ноч прайшла —
Я выбег з дому,
Бачу: тоненькі лядзяш
Там, дзе ка́паў сок з надлому.
Я сарваў яго ўгары,
Я лізнуў — лядзяш салодкі.
— Карамель! —
Крычу ў двары,
Каб пачулі аднагодкі.
Хлопцы просяць:
— Пакажы!

— Дай лізнуць!..
Зайздросцяць збоку:
Іх не цешаць ледзяшы,
У якіх — ні кроплі соку.

Маладзенькі клёнік наш
Перавяжам мы, умельцы,
І разломім мой лядзяш —
Кожнаму па карамельцы.



## ЖАВАРАНАК

Снег ляжыць на пляжы,
Сонца — рэдкі госць.
А ў кватэры нашай
Жаваранак ёсць.
Позна ён кладзецца,
Раненька ўстае.
Цэлы дзень смяецца,
Цэлы дзень пяе.
За катом аж скача,
А папросіш: «Ляж» —
Кнігаўкай заплача
Жаваранак наш.
Толькі не ахвочы
Доўга плакаць ён —
Расцвітаюць вочы
Сінія, як лён.
Зноў з катом сваволіць,
Зноў пяе зімой
Жаваранак звонкі —
Брацік меншы мой.

## ГНЯЗДЗЕЧКА

Я знайшоў за рэчкай
Куст парэчак,
А пад ім гняздзечка —
Пяць яечак.
Днём, як вартавы, я
Там, пры птушках,
Сню яечкі тыя —
У вяснушках.
Не сказаў нікому,
Дзе гняздзечка,
Сам не ўзяў дадому
Ні яечка.
Як разгорнуць крылы
Птушаняты,
Вам сакрэт адкрыю,
Дашкаляты:
Пакажу за рэчкай
Куст парэчак,
А пад ім гняздзечка —
Без яечак.

## ВЕЛАГОНКА

Гоншчыкам удачы
Зычыць наўздагон
Гарадок дзіцячы —
Цэлы стадыён.

Гоншчыкі не кволыя,
Гоншчыкі пакуль
Едуць — кола ў кола,
Едуць — руль у руль.

Хто вянок прымерае?
Хто з іх пераможа?
Ні адзін наперад
Вырвацца не можа.

А вянок гатовы —
У руках дзяўчынак,
Праўда, не лаўровы —
З бэзавых галінак.

Гоншчыкі тым часам —
Добра бачна зблізку —
Перасеклі разам
Фінішную рыску.

Гарадок дзіцячы
Зноў прыйшоў у рух:
Як вянок удачы
Падзяліць на двух?

Пашумелі крышку
І рашылі ўсе:
Хай вянок без крыўды
Носяць па чарзе.

## КАЦЯРЫНКА

Кацярынка з дзецьмі ладзіць.
Села пад акацыяй
У двары сваім,
На лаўцы,
Весела расказвае:

—Наша Зінаіда Львоўна
Не сярдуе, не крычыць.
Я на пальчыках чароўных
Навучылася лічыць.
Не чакаю я падказкі
Ад настаўніцы, сяброў.
Я сама чытаю казкі
Пра асілкаў,
Пра звяроў.
А сягоння бабцы, дзеду
Напісала першы раз:
«Я з пяцёркамі прыеду
На канікулы да вас...»

Да навукі Каця здатная,
Вучыцца — не мучыцца.
І зайздросцяць ёй,
Выдатніцы,
Тыя, хто не вучыцца.

## ДЗЕ НАЧУЕ НОЧ



Без падказкі дзедавай,
Сам, не збіўшы ног,
Васілёк даведаўся,
Дзе начуе ноч.

Там, на дне калодзежа,
Змрок і ў ясны дзень,
Глянуўшы, калоціцца
Сонечны прамень.

Толькі як жа месціцца
Там, у трубах, ноч —
З Млечным Шляхам,
З месяцам,
З зоркамі наўзбоч?

Мо калодзеж дзедаў
Казачны, без дна?
Ды пра гэта ведае
Толькі ноч адна.

## ПАДАРУНАК

Падарылі мне азерца:
Усяго вады —
З вядзерца.



Беражкі шкляныя,
Беражкі крутыя.
А ў вадзе блакітнай —
Рыбкі залатыя.
Я ахоўваць рыбак буду.
Лапку кот падняў —
Як вуду,
Не выходзіць з хаты
Рыбалоў вусаты.

А ўсяго вады —
З вядзерца.
Што за дзіўнае азерца?

## ПРЫГОДА

Ці хто з вас, дзеці, бачыў,
Як Паўлючок рыбачыў?

Спужаўся небарака:
Злавіў на вуду ра́ка,
Не ра́ка, не — рачка́.
Баіцца зняць з кручка.

На крык прыбег Сярожа,
А памагчы — не можа.

— Не лезь!
— За хвост бяры! —
Спрачаюцца сябры,
Не знаюць, як з кручка
Без страху зняць рачка́:
Ён хоць і невялічкі,
Ды клюшні —
Як нажнічкі!

І Шарык брэша збоку —
Рачок адбіўся ў воку.

Пакуль шумелі ўтрох,
Рачок ім сам памог:
Абрэзаў клюшняй лёгка
Капронавую лёску,
Паслухаў трошкі спрэчку
І — плюх назад у рэчку!..

Ото была прыгода —
Смяяліся паўгода!



Бібліятэка СШ №36
г. Мінска
інв. № 39646

## ІМЯНІННІК

Ён нізенькага росту
І любіць нас, малых.
На бегавой дарожцы
Апераджае ўсіх.

Ён пад дажджом і снегам
Адбегаў год якраз.
І запрашае брэхам
На імяніны нас.

Ён любіць грызці косці,
Скарынкі, сухары.
«Што нам узяць у госці?» —
Гадаем у двары.

Пірожныя-грыбочкі
З пяску спяклі наспех,
А ён панюхаў моўчкі,
Пакрыўдзіўся і збег.



## ЦЯЛЯЧЫ САДЗІК

Адны на пашу
Пайшлі каровы —
За рэчку нашу,
За гай дубовы.

Уладзік рады,
Аж плешча ў ладкі:
У загарадзе
Стаяць цяляткі.

Сястрычцы Любе
Крычыць Уладзік:
— Глядзі, пад дубам
Цялячы садзік!

## ЯГАДНІК

Вярнуўся з лесу
Ягаднік Фядот.
У соку — пальчыкі,
У соку — рот.

Пытае маці,
Гледзячы ў збанок:
— Ці шмат сунічак
Назбіраў, сынок?

Пусты збанок,
Ды хваліцца Фядот:
— Ой, мама, шмат,
Аж забалеў жывот!

## КАМАРЫ-КАМАРЫКІ

Камары-камарыкі,
Цяжка вам:
Аддалі ліхтарыкі
Светлячкам.

Да акенца туліцеся
Уначы:
Цёмна вам на вуліцы
Мак таўчы.

Паблажэлі тварыкі
Не з дабра.
Камары-камарыкі,
Спаць пара.

Маку ўдосталь маеце —
Толькі важ!
Раніцай злятаеце
На кірмаш.

Купіце ліхтарыкі
Там за мак.
Час і вам, камарыкі,
Спаць, аднак.



## ПАЦЕШКА

Сястрычка задала задачу:
Крычыць,
Заходзіцца ад плачу.

Змітрок бяжыць,
І Стась бяжыць —
Сястрычку трэба рассмяшыць.

— Не плач! —
Змітрок да слёз смяецца,
Здаецца,
Смехам захлынецца.

Смяецца Стась
Яшчэ званчэй —
Аж слёзы сыплюцца з вачэй.

Сястрычка ўжо смяецца, бачаць,
А самі —
Над каляскай плачуць.

## ДРАЖНІЛКА

Прычапіўся Апанаска,
Просіць Васіля:
— Падражніся,
Калі ласка,—
Пасмяюся я.

— Апанаска босы
Ходзіць у спадніцы,
Заплятае косы,
Носіць завушніцы!..

Апанаска
Біцца лезе:
— Сам,
Нябось,
Такі!..
І качаюцца
Па снезе
Дружбакі.





## ЛІЧЫЛКА

Нехта
Недзе
Яблыкі дзяліў:
— Табе, Федзя,— наліў,
Табе, Сцяпан,— шафран,
Табе, Сымон,— антон,
Табе, Пётр,— апорт,
Табе, сястрычка,— дзічка.
А табе, Даніла,
Не хапіла!





## ПРЫГАВОР

Ліпы, ліпы,
Расцвітайце ўсюды,
Цвету дайце
Ад прастуды,
Мёду дайце
Пчолкам,
Нам — таксама,
Каб паправілася мама.

## ЗАКЛІЧКА

Злазь, каток, з чарэні,
Не ўцякай у сені.
    Ідзі, каток,
    У наш гурток.
Пачытаем кніжку
Пра ката і мышку.

## СКОРАГАВОРКА

Рыгорка на падворку
Знайшоў скорагаворку:

Печка — гняздзечка,
Там перапечка.
Ды перапечцы
Горача ў печцы,
І перапечка
Збегла з гняздзечка...

Скажы, скорагаворка,
Ці з'еў цябе Рыгорка?

## ЗАГАДКА

Што за ключ крылаты
Знік за небакраем?
Ні гумна, ні хаты
Ім не адмыкаем.

## АТЭЛЬЕ «ПРАМЕНЬ»

### Казка

Пяць гадоў вучыўся ў цырку
На краўца Мядзведзь.
Спаў з машынай упрыцірку,
Каб дыплом займець.
І адкрыў нарэшце ўдала
Ў лесе атэлье:
Пад ялінай, як пад дахам,
Цёпла, дождж не лье.
На галлі вісяць тканіны,
Стол — шырокі пень.
Строчыць швейная машына
Ў атэлье «Прамень».
І пры месяцы, бывае,
Не засне кравец:
Спец адзіны,
Абшывае
Лес з канца ў канец.

У чарзе парадак строгі.
Да чаргі глухі,
Лось — разгалістыя рогі —
Лезе без чаргі,
Лезе са слязамі,
Лезе ледзь жывы —
Абляпіла заедзь
З ног да галавы.
Стогне Лось каля машыны:
— Я трываю ледзь!
Плашч-накідку з мешкавіны
Мне пашый, Мядзведзь.
Бачыш сам, гарачым роем
Заедзь смокча кроў.
Рогі грозныя —
Не зброя
Супраць камароў.

Прыцягнуўся Воўк з кульбакай
У трусах адных,
Вые:
— Леснікоў сабака
Мне спусціў штаны!
Голы, як у лазні,
Галадаю зноў:
Сорамна вылазіць
З лесу без штаноў.
Дык пашый другія, дружа,
Не завузь, аднак:
Цяжка будзе ў модных дужа
Бегаць ад сабак.
Выхадная, не палюе
На курэй Ліса.
Тут, у атэлье, хвалюецца:
Дзе яе краса?
Быццам з перламутру,
Зззяюць зубкі ўсе.
Не да твару футра
Толькі ёй, Лісе:
Выцерлася ў лесе.
Страх, як мох, расце —
Хутка поўсць аблезе
Нават на хвасце.
І стаіць на задніх лапах
З просьбаю цяпер:
— Футра мне пашый, Патапыч!
Выкрай мне каўнер,
Выкрай хвост абавязкова,
Каб не знаць бяды:
Будзе чым ля хат вясковых
Замятаць сляды.

Прыкусіў ад страху, мабыць,
Тонкі язычок,
Заікаецца без мамы
Заяц-шарачок:
— П-покуль з морквай дзялак
Не заслаў сняжок,
Мне п-пашыйце, дзядзя,
Белы кажушок,



Шапку-невідзімку —
Каб было л-лягчэй
Ратавацца ўзімку
Ад ліхіх вачэй.
С-сам у белым,
Вецер белы,
Белая зямля.
П-перастану, можа, бедны,
Заікацца я.

Вожык ноччу ўпаў з абрыва,
Бок абдзёр, скалоў,
Ды ў чарзе стаіць цярпліва
Вожык-змеялоў.
Жаліцца Мядзведзю:
— Выручце хутчэй —
Камізэлька з'едзе,
Бачыце, з плячэй.
Я баюся вос пякучых
І пчаліных джал.
Спадзяюся,
Ў вас калючы
Ёсць матэрыял.
Ён цяпер у модзе,
Дайце паглядзець.
— Не завёз,—
Разводзіць
Лапамі Мядзведзь.—
Маю замшу, драп дабротны,
Ёсць сукно, паркаль.
А калючага, як з дроту,
Не завёз, на жаль.

Буду мець на ўвазе,
Памагу:
На базе —
У хваінах,
У ялінах —
Ёсць матэрыял
Ад асіных,
Ад чмяліных
І пчаліных джал.

Валам валяць да Мядзведзя,
Ён ажно зароў:
Паспявае ў лесе ледзьве
Абшываць звяроў.
Лета ўсё
Курэлі сцежкі
Між камлёў, лаўжоў.
З Белавежскай пушчы пешкі
Нават Зубр прыйшоў.
Ад заказчыкаў адбою
І цяпер няма.
Добра, што над галавою
Дыхае зіма.
Дзеркачом падмёў абрэзкі,
Склаў начынне ў клець
І ў бярлогу лёг нарэшце
Адпачыць Мядзведзь.
А на пні аб'яву крыва
Выразаў за дзень:
«Да вясны закрыта
Атэлье «Прамень».



## ЯК ЗАЙЦЫ З ТУШКАНЧЫКАМІ Ў ФУТБОЛ ГУЛЯЛІ

**Казка**

### I

Самалёт над пушчаю
Ніжай звузіў круг,
Сеў вялізнай птушкаю
На паляну-луг.
Першы раз тушканчыкі
Ў глыб лясную трапілі.
З чамаданчыкамі
Ледзьве сходзяць з трапа,
Аж хістае слабых:
Блага ім, няйначай,
Футбалістам слаўным
З Афрыкі гарачай.

— Дзе ў вас душ, скажыце,—
Просіць трэнер-госць.
— Вунь ён, у блакіце,
Хмарка — душ і ёсць! —
Кажа Зубр лагодны,
Зняўшы капялюш.—
Калі ласка, госці,
Пад блакітны душ!..
Дождж і сонца прамяністае
Памаглі, няйначай,—
Акрыялі футбалісты
З Афрыкі гарачай.

### II

Ліс-суддзя апоўдні
Выбег, даў свісток.
Мяч звініць над полем
Выбітым, як ток.
Афрыканцы мажуць
За́пар два разы,—
Жоўценькія майкі,
Сінія трусы.
Мажуць,
Ды не падаюць
Духам ад няўдач —
Па́самі дакладнымі
Адрасуюць мяч.
Стадыён падказвае,
Стадыён гудзе:
Заяц у падкаце
Мяч забраў,
Вядзе.
Сам ударыць, мабыць,



Вырашыў касы —
Беленькая майка,
Чорныя трусы.

Першым нечакана
Воўк завыў як мог:
Зайца-капітана
Госці збілі з ног.
Пры варотах зараз
Тоўпяцца гусцей:
Ліс штрафным ударам
Пакараў гасцей.

— Гол!..—
Равуць трыбуны,
Тупат навакол:
Капітан трыгубы
Не прамазаў —
Гол!..

Мяч вядуць тушканчыкі,
Мяч вядуць утрох,
Б'юць пяску фантанчыкі
З-пад імклівых ног.
Міг —
І госці, ззяючы,
Аж ляцяць наўскач:
Нападаючыя
Адквіталі мяч.
Плача, твар закрыўшы,
Заяц-варатар:
Адступіўся крышку
І — не лёг на ўдар.

Зноў віраць трыбуны,
Гул з усіх бакоў —
Асуджаюць бурна,
Хваляць ігракоў.
Мяч вядуць тушканчыкі,
Мяч вядуць утрох,
Б'юць пяску фантанчыкі
З-пад імклівых ног.
Да зайцоў са злосцю
Ліс бяжыць наўпрост:
Абаронца госцю
Наступіў на хвост.
Вінаваты каецца,
Ды няўмольны Ліс —
Афрыканцы
Маюць шанцы
Павялічыць лік.
Б'юць трыбуны ў ладкі:
Кінуўся на ўдар,
Мяч дастаў з дзевяткі
Заяц-варатар.
Выбіў мяч някепска —
Ігракам на ход,
З твару змятай кепкай
Выцірае пот.
А зайцы населі,
А зайцы як бач
У чужую сетку
Закацілі мяч.

Госці рвуцца ў наступ,
Іх запал не згас,
Ды свісток фінальны
Прагучаў якраз.
Воўк рахманы вые:
— Ма-лай-цы́ зай-цы́!..
Аж дрыжаць на выхадзе
Тыя малайцы́.
Скача зайчанятка —
Капітанаў сын:
— З перамогай, татка!
Два — адзін!

## III

Провады ўрачыстыя —
Пушча ўся галёкае:
Адлятаюць футбалісты
Ў Афрыку далёкую.
І зайцы камандзе
Пажадалі ўдач,
Падарылі майкі
І шчаслівы мяч.
Ліс-суддзя адразу
Перадаў свісток,
Зычыць, каб не мазаў
Ні адзін ігрок.
Зубр стары ўсміхаецца,
Дорыць капялюш,
Пад якім схаваецца
Ўся каманда слаўная —
Адзіна́ццаць душ.
Госці ціснуць лапкі
На хаду зайца́м,
Запрашаюць з трапа:
— Прылятайце к нам!..
Круг зрабіў над пушчаю,
Лёг на курс хутчэй,
Знік маленькай птушкаю
Самалёт з вачэй.

## РАЗУМНАЯ ВАРОНА

### З народнага

У птушыным царстве
Дуб адвеку рос,
А на ім, купчастым,
Жыў вясёлы Дрозд.
Жыў, нібы на дачы:
Цішыня, краса.
Ды аднойчы, бачыць,
Госць ідзе — Ліса.
Кошык жоўты з лубу
Выпусціла з лап
І хвастом па дубе —
Ляп, ляп, ляп!
А сама гразіцца,
Хітрая Лісіца:
— З дуба, Дрозд, скачы —
Буду дуб сячы!
— Як жа дзеці, хатка?
— Скінь адно дзіцятка
Ў кошык мой,
На суп,—
Цэлы будзе дуб.

Дрозд-бядак раздумваў,
Дрозд трываў паўдня,
Ды нарэшце з дуба
Скінуў птушаня.
Як Лісу ўлагодзіць?
Смачны з мясам суп —
Кожны дзень прыходзіць
Секчы тоўсты дуб.
Дрозд не спіць на дачы,
Не пяе даўно.
Засталося, бачыць,
Птушаня адно.
Прыляцеў у клёны
Да Вароны
Дрозд,
Расказаў, як мучыцца
Праз Лісіны хвост.
Плача:
— Хто паможа?..
А Варона вучыць:
— Дурань,
Гэта ж здзек!
Дрэва ссекчы можа
Толькі чалавек.
Спі спакойна, Дрозд:
Не сякера — хвост!..

Дрозд запеў на дачы,
Выспаўся ў гняздзе.
А назаўтра, бачыць,
Зноў Ліса ідзе.
Кошык жоўты з лубу
Выпусціла з лап
І хвастом па дубе —
Ляп, ляп, ляп!
— Хоць ілбом у дрэва! —
Дрозд крычыць.—
Дарэмна!
Цэлы будзе дуб!
Еш нішчымны суп!
— Бачу, знаеш многа.
Хто цябе, дурнога,
Навучыў?
— Варона.
— Тая, з клёна?
— З клёна.
— Я ж ёй не дарую,
Абскубу старую!..

І Ліса ад гаю
Адышлася трохі,
Быццам нежывая,
Выцягнула ногі.
За Лісою сочыць,
Думае Варона:
«Выдзеўбу ёй вочы!»



І зляцела з клёна,
Трапіла ў палон —
Пад Лісою б'ецца,
Рвецца з лап на клён.
А Ліса смяецца:
— Занясу ў нару —
Супу навару!
— Суп зварыць мудрона,—
Кажа ёй Варона.—
Толькі марна ў печы
Дровы пагараць —
Будзеш цэлы вечар
Пер'е скубці-драць:
Бачыш, я старая.
Хочаш, дык параю,
Як зрабіць?
— Кажы!
— Рэшаты злажы
Так, каб я ўсярэдзіне
Не лягла, не ўседзела,
І — пусці з гары.
Потым суп вары:
Чыста так, павер мне,
Пер'е абскубецца,
Разляціцца пер'е —
Мяса застанецца...
А Ліса і рада:
— Добрая парада!
Будзеш ведаць, грэшная,
Як вучыць Дразда
Кпіць з майго хваста!..
І Варону ў рэшаты
Мігам усадзіла,
Тыц —
З гары пусціла.

Раскаціліся
Ў лагчыне
Рэшаты з разгону,
І Ліса вачыма
Правяла Варону —
З рэшатаў на крону.
З той пары купчасты
Абыходзіць дуб,
У птушыным царстве
Есць нішчымны суп.





# ЯК ДОМ БУДАВАЛІ



Побач з садзікам дзіцячым
Вырас новы гмах.
Знізу глянеш —
І не ўбачыш,
Дзе згубіўся дах.
На трынаццатым паверсе
Васілёк жыве,
І не страшна спаць, паверце,
Там, у сіняве.
Не адразу дом падняўся,
Вырас да нябёс —
Ён з падмурка пачынаўся,
Па цаглінцы рос.
Зелянеў вішняк наўкола
Год таму назад,
Васілёк хадзіў не ў школу,
А ў дзіцячы сад.
Помніць, як загуў увішны
Экскаватар тут —
І змяніўся
Іх зацішны,
Іх зялёны кут.
У траве сцяжынка спала,
Скрозь бялеў туман,
А машына ўжо капала
Яму-катлаван.
Драў карэнне коўш трывалы,
Грунт пясчаны грыз,
І лятаці самазвалы





То наверх,
То ўніз.
А пасля з бетону блокі
Ў катлаван ляглі,
Каб стаяў ён,
Дом высокі,
Цвёрда на зямлі.
І пад'ёмны кран уранні
Завітаў у двор,
Падаваў на рыштаванні
Цэглу і раствор.
Не ляжалі без работы
Кельмы муляроў —
Прывыкалі да спякоты,
Слоты і вятроў.
І глядзеў,
Нібы на дзіва,
Васілёк тады,
Як сцяну кладзе рупліва
Муляр малады.
Браў навобмацак цагліну,
Стукаў кельмай ён —
І ў паветры плыў хвіліну
Меладычны звон.
Муляр радаваўся:
Цэгла —

Быццам на падбор.
І сачыў, каб роўна легла
Зверху, у раствор.
Стукаў кельмаю чароўнай
І ўсміхаўся ён,
Бы ў сцяну сваю ўмуроўваў
Меладычны звон.
На цагліну клаў цагліну,
Прытрымаў адну —
Васільку падаў, як сыну:
«На, кладзі ў сцяну!»
І растворам край пазначыў
Так, каб Васілёк
Мог цагліну тую бачыць
Зблізку і здалёк.
Падымаўся дом патроху,
Рос і ў стынь,
І ў золь.
Насцілалі з пліт падлогу,
Мацавалі столь.
А яшчэ за клопат пільны
Дзякуй сталярам:
Шмат дзвярэй яны зрабілі,
Шмат аконных рам.
Шыбы вымыў першы лівень —
І заззяў ён,
Дом,
Быццам вокны ўсе зашклілі
Сонечным святлом.
Пад цаглінай той,
Памечанай,
Бачыў Васілёк,
Як на фортачцы трапеча
Промень-матылёк.





Кожны дзень прыносіў змены,
Добры неспакой:
Тынкавалі ў доме сцены,
Васількоў пакой.
А паклеілі шпалеры,
Дык нібы з бяроз
Лісця жоўтага ў кватэры
Чараўнік натрос.
Васілька разбудзіць сонца,
Гляне ён —
І рад,
Быццам выскачыў спрасонку
Ў гай, дзе лістапад.
Клалі елачкай прыгожай,
Клалі як шчыльней
З дубу дошчачкі ў прыхожай,
З дубу — ён цямней.
Падбіралі,
Насцілалі
Дошчачкі далей:
Толькі з ясеню — у зале,
З ясеню святлей.
Абнавілі свежым лакам
Дошчачкі як след —
І зіхціць,

І вока лашчыць,
Як бурштын, паркет.
Не палохаюць завеі
У зімовы час:
Добра грэюць батарэі,
Ёсць святло і газ.
Запрашае ў лета ванна —
Беленькі ставок,
У якім купацца ўранку
Любіць Васілёк.
І па лесвіцы не трэба
Тэпаць — сходак шмат:
Ліфт за так падыме ў неба,
Ліфт звязе назад.
Дах накрылі —
Не свіціцца
Там, у сіняве,
Дзе над самым домам ціха
Воблачка плыве.
Б'е пярун цяпер, бывае,
Навальніца —
Жах,
Ды і кропля дажджавая
Не праточыць дах.
Дом абклалі пліткай новай,
Яркай, як эмаль,
І цагліны Васільковай
Не відаць, на жаль.
Ды не тоіць ён ад таты,
Ад сваіх сяброў:
Прыйдзе час —
Збярэ ў брыгаду
Лепшых муляроў.
І тады з цаглін, вядома,
Выбера адну,
Хлапчуку падасць малому:
«На, кладзі ў сцяну!»
І растворам так пазначыць,
Каб хлапчук пасля
Мог цагліну тую бачыць
Зблізку і здаля.
Ён і сад збудуе дзецям,
Майстра-брыгадзір,
Толькі каб на белым свеце
Быў заўсёды мір.





# ЗАЙЧЫК
# СА
# СКАКАЛКАЙ



## НАРАЧ

Край лясоў пявучых,
Край азёр дзівосных.
Лёгка тут, на кручах,
Дыхаецца ў соснах.

Сонца лашчыць твары,
Цешыць ветрык рэзкі.
Падарыла Нарач
Першыя пралескі.

Ноччу не завялі
Кветкі лесавыя,
Быццам гэта — хвалі
Кропелькі жывыя.

Зблізку і здалёку
Прыязджаюць госці —
Тут на кожным кроку
Неруш прыгажосці.

## ДЗЕ ЖЫВУЦЬ КАЗКІ

У садзіку дзеці гуляюць,
Прымерваюць маскі.
Гадаюць:
Далёка ці блізка
Жывуць яны,
Казкі?

— За морам...
— У пушчы дрымучай...
— У цёмнай пячоры...
— У ступе лятучай...
— За хмарамі недзе,
На іншай планеце...

Сказала, падумаўшы, Каця
Сама, без падказкі:
— У вёсцы,
У бабчынай хаце,
Жывуць яны,
Казкі.

## БУЛЬБІНКА

Дзеці ў садзе цесна
Абступілі Дзімку
І гадаюць-цешацца,
Хто на фотаздымку.

— Віславухі, як сабачка,
Я такога ў дзеда бачыў.

— Вочы быццам у ката́.
Ды чаму няма хваста?

— Круглы нос, як пятачок.
Пэўна, гэта парсючок!

— На бычка падобны трошкі.
Толькі дзе згубіў ён рожкі?

— Ой! Пазнаць адразу цяжка.
Мо на здымку Чабурашка?..

Паглядзела Оля,
Весела гукае:
— Знаю!
Гэта з поля
Бульбінка такая!

## БОРШЧ З КРАПІВЫ

Нам зварыла мама
Сёння смачны боршч:
З'елі ўвесь —
І мала,
Хочацца, каб больш.

Ад усіх
Сказаў я:
— Дзякуем за шчаўе.

Усміхнуўся дзед:
— З крапівы абед!

Мы глядзім,
Не верым —
Я, Пятрок і Вера.

Бачым, наша мама
Усміхаецца таксама:
— Праўду кажа дзед,
З крапівы — абед!

Першай да люстэрка
Кінулася Верка,
Затаіла дух:
Ці язык не ўспух?

А люстэрка Верцы
Усміхаецца:
Крапіва ў талерцы —
Не стрыкаецца.



## КАКАДУ

У Сымонкавай кватэры
Папугай жыве —
З белым брушкам,
Жоўта-шэры,
Чуб на галаве.

Ловіць дзюбкаю спрасонку
Сонечны прамень.
І вітае ён Сымонку:
— Доб-ры дзень!

Даспадобы сыр, і каша,
І арэшкам рад.

А калі наесца, кажа:
— Дзя-куй, брат!

Нагуляўшыся, Сымонка
Вернецца з двара —
Папугай напомніць звонка:
— Спаць па-ра!

Разумее ўсё, здаецца,
Ловіць на ляту.
А спытаеш, як завецца,
Скажа:
— Ка-ка-ду!

## ПТУШЫНАЕ МАЛАКО

Сябры бягуць са школы
Адразу ў Ясеў двор:
Ён выдумшчык вясёлы,
Вялікі фантазёр.

Ваду бярэ са студні
Ды запрашае ў дом:
— Я ўсіх вас пачастую
Птушыным малаком.

— Хвалько!—
Не верaць дзеці,
Смяюцца з дружбака:—
Няма на белым свеце
Такога малака!..

Ваду аднёс таропка,
І вось замерлі ўсе:
Ясь нейкую каробку,
А не гладыш нясе.

Яшчэ здалёку горда
Крычыць:
— Ну хто хвалько?! —
І ўсіх частуе тортам
«Птушынае малако».



## РАДАВЫ

Грышка стрыгчыся прыйшоў
З афіцэрам —
Родным братам.
Ён адзіны з малышоў —
У пілотцы,
З аўтаматам.

Упрасілі, каб пілотку
Грышка скінуў
З галавы.
І пытае дзед з барадкай:
— Як пастрыгчы,
Радавы?

Грышка сціснуў аўтамат.
Зірк — на дзеда.
Зірк — на брата.
І сказаў з усмешкай брат:
— Пастрыжыце...
Як салдата!

## СТРАХ

Вялікія вочы ў страха,
Яшчэ большыя —
У Стаха.

На лоўж баіцца глядзець —
Здаецца, ляжыць мядзведзь.
І думка адна ў галаве:
А раптам мядзведзь зараве,

Падымецца —
Грузны,
Высокі!..

І кінуўся Стах наўцёкі.

Ды ногі лёгкія ў страха —
Ніяк не адстане ад Стаха.





## ГРЫБАСЕЙ

Ён вясёлы, дзед Яўсей,
Бае: — Дожджык-грыбасей
Ходзіць ноччу, не прысядзе,
Бачыш, пабываў і ў садзе...

Я вачам не веру. Дзіва!
Не асінка тут, а сліва,
Ды з травы,
Нібыта ў лесе,
Падасінавічак лезе.
Збоку, дзе гусцей трава,
Не адзін грыбок, а два:
Кожны крэпенькі, таўсматы,
Не іначай як блізняты.
Будзе болей: ля камля,
Бачу, горбіцца зямля,
Аж варушыцца рупліва,
Як жывая...
Вось дык дзіва!
Дзед Яўсей, гляджу, смяецца:

— Дзіва простае, здаецца!
Лес грыбны —
Мая любоў,
Перабраў я шмат грыбоў.
А карэньчыкі чарвівыя
Выкіда́ў вось тут,
Пад сліваю,

Выкіда́ў машок, ігліцу —
І ўтварылася грыбніца
Ў садзе нашым, як у лесе.
Бачыш, грыб за грыбам лезе.
Бабка зварыць верашчаку —
Праглынеш язык ад смаку!..

Я даўмеўся над грыбамі:
Ён з бародкай,
Ён з вусамі,
Гэты дожджык-грыбасей,
А завецца — дзед Яўсей.

## ЯК ЖУК БАРАВІКІ ЗБІРАЎ

Сярожа ў вёсцы баяў,
Каб чулі хлапчукі:
— Я навучу сабаку
Збіраць баравікі!..
І вось Жука́ паклікаў,
Паставіў пры кашы,
На баравік вялікі
Паказвае:
— Брашы!
Як быццам цяміць вучань:
Панюхаў баравік
І, забрахаўшы гучна,
У лесе цёмным знік.
Няйначай, дапаможа —
Шукаць грыбы пабег,
І кінуўся Сярожа
За ім, пачуўшы брэх.
А Жук яму на ўцеху
Заходзіцца ад брэху —
Не бачачы, паверыш,
Што ён напаў на неруш.
Ператварыўся ў слых,
Трывожыцца Сярожа:
Баравікоў усіх
Адзін
Сабраць не зможа.
Задыхаўся ад спешкі,
Дапяў да месца ўсё ж,
Ды нават сыраежкі
Не палажыў у кош.
Сабака брэша, чуе,
Ужо ў другім баку,
І ён назад шыбуе,
Паверыўшы Жуку́.
А Жук ажно якоча:
Адбіўшыся ад рук,
Шукаць грыбоў не хоча —
Ганяе зайца Жук.
Сярожа, як алень,
Прабегаў цэлы дзень,
Згубіў дзядулеў нож,
Аднак — парожні кош.
Смяюцца хлапчукі:
— Відаць, баравікі
Сабака з'еў
У лесе!..
А Жук пад ногі лезе
І лашчыцца, харошы,
Цяпер, пасля вучэння,
Як быццам у Сярожы
Ён просіць прабачэння.





## БАРАНА НА ДРЭВЕ

Вясной у полі дбала
Яна зямлю баранавала.
Чаму ж цяпер яна
Ляжыць на дрэве,
Барана?

## ШТО ЗА ГАСПАДЫНЯ?

Напячэ аладак
Белых — не замажа,
Хоць сама заўсёды
Чорная, як сажа.

## КАМУ Ў ДЗЯЖЫ ЦЕСНА?

Як пачуеш, прэч
Пудка не бяжы:
Пыхкае, бо ў печ
Просіцца з дзяжы.

## ЖАР-ПТУШКА

Хоча знаць дачушка,
Дзе жыве жар-птушка.
На зямлі?
Ці мо ў блакіце?
Хто даўмеўся, падкажыце.



## ЛІСТАПАД

Лісток апаў —
Для нашай Веры.
Яшчэ адзін...
Іх шмат.
Збіраць гербарый
Тут, у скверы,
Ёй памагае
Лістапад.



## ЗАЙЧЫК СА СКАКАЛКАЙ

Хто ў лесе скача змалку?
Ён знае, Дзед Мароз,
Ён зайчыку скакалку
І апельсін прынёс.

Усюды снег глыбокі,
Далёка да вясны —
Сумёты, як аблокі,
Укрылі кут лясны.

Ды зайчык не гультайчык,
Яму не страшны снег —
І днём ён скача, зайчык,
І ноччу скача ў сне.

Вясёлы, не заплача,
Аддасць ён апельсін
Таму, хто пераскача
Яго сярод ялін.

## ДЫЯФІЛЬМ ПРА МОРА

Хочацца на рэчку,
Ды вясна — не скора,
І якраз дарэчы
Дыяфільм пра мора.
Добрымі вачыма
Мама фільм здымала,

І пра Сашу з Дзімам —
Кадрыкаў нямала.
На дварэ завея,
А гасцям здаецца —
Цёплы ветрык вее,
Сонца ў вокны льецца.

*Кадрык першы*

## ПРЫБОЙ

Смугой спавіты далі.
А тут, ля самых ног,
Накочваюцца хвалі
На берага парог.

Вачэй не зводзіць Саша:
З разгону хваля ляжа
На камяністы схіл,
Адкоціцца без сіл.
А ўжо хутчэй другая
На бераг набягае,

Карункі з пены вяжа,
Пакуль сама не ляжа,
Не кінецца назад —
Пад новы вадаспад.

Бягуць бясконца хвалі
І Сашу на ўспамін
Каменьчыкі-каралі
Шліфуюць, як бурштын.

*Кадрык другі*

## СУЛА

Як казачнае дзіва,
Яно, жывое мора —
Без астраўка адзінага
Бязмежная прастора.

А Сашу ўспамінаецца
Далёкая Сула́ —
Рачулка,
Што ўсміхаецца
Ля роднага сяла.

Сярод жытоў і лёну
Бяжыць у свет яна —
Ні кропелькі салёнай
І чыстая да дна.

Пад луг,
Далей ад віру,
Вада яшчэ святлей —
Ад залацінак жвіру,
Ад сонечных лілей.

Без бухтаў і заліваў,
Ды поўная святла —
Яна таксама дзіва,
Маленькая Сула́.

*Кадрык трэці*

## ДЗІМА

Не плавае яшчэ,
Малы ён, брацік Дзіма.
А сонца так пячэ —
Уседзець немагчыма.

Купацца добра ўдвух,
Ды ён крычыць: «Баюся!»
Надзьмулі Дзіму круг —
І плавае на крузе.

То ўлягуцца, то зноў
Калышуць хвалі дбала,
Як мама перад сном
Калісьці калыхала.

Абвыкнуў неўпрыкмет
І радуецца Дзіма —
На бераг і ў абед
Дазвацца немагчыма.

*Кадрык чацвёрты*

## ЯБЛЫНЬКА



Пад небам нізкім, шэрым
Гулялі хвалі ўчора,
І яблыньку на бераг
Яны прынеслі з мора.

Вада не цешыць болей,
Бягуць сябры да Сашы:
Надзею — дрэўца кволае
Ён пасадзіў на пляжы.

Каб прынялося ў спёку,
З далоняў палівае,
Нібы вада здалёку,
Нібы вада — жывая.

Руплівa дрэўца гоіць,
Рукою гладзіць зрэдку,
Нібы ад ласкі голле
Зазелянее ўлетку.

Сябры спрыяюць Сашу,
Руплівцу-чарадзею,
Аберагаюць саджанец—
Ужо і іх надзею.

На шчасце загадалі
І хоць у сне, а ўбачаць,
Як спелымі пладамі
Ім яблынька аддзячыць.

*Кадрык пяты*

## МАТЫЛЁК

Купаюцца малыя,
А з Дзімам дык бяда.
— Хачу дадому,—
Ные.—
Салёная вада!

А над зямлёй віецца,
Трапеча матылёк.
Стаміўся ён, здаецца,
Бы прыляцеў здалёк.

Бялюткі, як рамонак,
Прысеў на Дзімаў круг,
Як быццам тут не мора,
А матыльковы луг.

Нібы пялёсткі, крыльцы—
Жывая прыгажосць.
Ён нечаканы крышку,
Але жаданы госць.

Святлее твар у Дзімы,
І Саша побач лёг,
Як быццам ён з радзімы
І праўда, матылёк.

*Кадрык шосты*

## ВЕРАБЕЙ НА ПЛЯЖЫ



— Чык-чырык! Чык-чырык!..
Што за шум? Што за крык?
Падсуседзіўся
Да Сашы
Верабей на пляжы.
    У шэрай майцы,
    У шэрых шортах—
    Памятых
    І пацёртых.
За кожнай хваляй сочыць,
Гульня ў яго такая:
То да вады падскочыць,
То ад вады ўцякае.
Пабыў на сонцы трошкі,
Глядзіць:
Хаця і скупа,
Ды загарэлі ножкі
І востры носік-дзюба.
Не звык вось так, без справы,
Чырыкаць і ў спякоту—
І верабейка жвавы
Сабраўся на работу.
    У шэрай майцы,
    У шэрых шортах—
    Памятых
    І пацёртых.
— Чык-чырык! Чык-чырык!—
Развітаўся ён і знік,
Тут пакінуўшы, на пляжы,
Перыйка—
Для Сашы.

*Кадрык сёмы*

## КАМЕНЬЧЫКІ-ПРАМЕНЬЧЫКІ

Да ночы ходзіць Саша
Па беразе адзін,
Каменьчыкі марскія
Збірае на ўспамін.

Калі ў цябе, гавораць,
Такі каменьчык ёсць,
То зноўку ты прыедзеш
Сюды, шчаслівы госць.

Каменьчыкі-праменьчыкі,
Любы́ сабе бяры—
І жоўты, і карычневы,
І колеру зары.

Пад сонейкам высокім
Нагрэліся за дзень,
І сапраўды, здаецца,
У кожным спіць прамень.

Да бляску, як каралі,
Адшліфаваны ўсе.
І гэты скарб свой Саша
Дадому завязе.

Мяшэчак цэлафанавы
Цяжэе — шмат сабраў:
І дзеду з бабкай хопіць,
І ўсім яго сябрам.

А жменьку Саша кіне
Яшчэ ў вірок малы—
Няхай яны, каменьчыкі,
Жывуць на дне Сулы́.





* * *

Скончыўся на гэтым
Дыяфільм пра мора,
Дыяфільм пра лета
Там, у краі горным.
Трошкі нечакана
Сцьмелі фарбы пляжа,
І сышоў з экрана
Да сяброў ён, Саша.
Як жывы праменьчык,
Што гарыць і ў замець,
Кожнаму каменьчык
Падарыў на памяць.

## КАЗКА ПРА ЗЯЗЮЛЮ

**З народнага**







— Ку-ку!
Ку-ку!..—
На рунь,
На спелы колас.
У песенным кутку
Чуваць самотны голас.
Спявае ў садзе шпак,
Сінічка з песняй скача.
Чаму зязюля так
Кувае — быццам плача?..
Даўным-даўно на свеце
Хлапчына жыў, Якуб,
З прыжмурам вочы светлыя,
Прыгожа віўся чуб.
Не меў сваёй сядзібы,
Не меў сям'і аднак.
І да сястры адзінай
Прытупаў ён,
Бядняк.
Ад голаду аслаб,
Зайшоў нясмела ў хату
І просіць:
— Дай хаця б
Кавалак хлеба брату...
Сястра ажно клянецца:
— І рада б памагчы,
Ды ад каморы недзе
Згубіліся ключы.
А там і свежы жытнік,
І мёд, і сала, браце,—
І пачала нібыта
Ключы шукаць у хаце.
А брат вады напіўся,
Сышоў у цёмны бор—
І ціха заблудзіўся,
Ад голаду памёр.
Не возьмеш слоў назад,
Сястра самá не рада—



І выбегла за сад
І кліча ў хату брата:
— Якуб,
Вярніся!
Ключы знайшліся...
Глядзіць, гусцее пер'е
На целе пад кашуляй—
Яна праз скупасць шэрай
Зрабілася зязюляй.
Смяецца ў небе сонца,
А ёй і свет не люб—
Лятаючы,
Бясконца
Заве:
— Я-ку-б!
Я-ку-б!..
Няма калі спяваць
У песенным кутку,
І толькі ўсё чуваць:
— Ку-ку!
Ку-ку!..

## ВОЎЧАЯ ГРАМАТА,
### або
## ЧАМУ ВОЎК ВЫЕ

### З народнага

Не выў лясны бадзяга
Ні дома, ні ў сяле,
Хоць і жылося блага
Без хлеба на стале.
Адваджвалі здаўна
Яго, ваўка старога,
Ад кожнага акна,
Ад кожнага парога.
Прагаладаў зіму,
Схуднеў нябога ўшчэнт—
І выдалі яму
Нарэшце дакумент:

ГРАМАТА
«Ваўку дазволена
Хадзіць па хатах,
Выпрошваць хлеб
У бедных і багатых...»
У лапе кій дарожны
Ды торба на баку —
І міласціну кожны
Выносіць жабраку:
Хто — хлеб,
Хто — сухары,
Хто — малака гладыш.
Знайшліся і сябры—
Сабака, кошка, мыш.
Ад'еўся воўк, акрэп,
На торбе спіць, а гладкі.
Ды раз ішоў па хлеб
І ў рэчку шухнуў з кладкі.
Прыбег ён да сабакі,
Трасецца ўвесь:

— Бяда!
Сцякае, бачыш,
З граматы вада.
А ваша печ дрыўмі
Напалена дарэчы,
Ты грамату вазьмі
І высушы на печы.
— Не сумнявайся, воўк,
Усё як трэба споўню.
А ты і сам прамок,
Ідзі сушыцца ў ёўню...
Сабака разаслаў

Лісток на чыстай дошцы
І так пасля сказаў
Сваёй сяброўцы—
Кошцы:
— Як грамата прасохне,
Аддай ваўку, прашу.
А я крыху на соек
За хатай пабрашу...
Лісток пад самым бокам
Духмяным хлебам пах,
І кошка краем вока
Прабегла па складах:
«Ваў-ку даз-во-ле-на
Ха-дзіць па ха-тах,
Вы-прош-ваць хлеб
У бед-ных і ба-га-тых».
Згадала пра абед
І, з'еўшы хлеб да крошкі,
На печы неўпрыкмет
Яна заснула, кошка.
Ударыла спрасонку
Хвастом, як ад спалоху,
І грамата прасохлая
Упала на падлогу.
А тут і мыш бяжыць
У свой куток з-пад жорнаў,
Глядзіць—
Лісток ляжыць
І пахне хлебам чорным.
Не знала: ёй таксама
Лісток ахоўваць трэба—
І згрызла тую грамату
Замест скарынкі хлеба.
У хату воўк ускочыў,
Не даглядзеўшы сну,
Аднак ніхто не хоча
Прызнаць сваю віну.
Надзей няма на цуд:
Ад граматы — ні знаку.
І воўк загнаў у кут,
Трасе найперш сабаку:
— Ах, чортава душа!
За што мяне, старога,
Зарэзаў без нажа,
Як ворага якога?
Без граматы ў сяло
Не пабяжыш па хлеб.
Чытаў, што там было
Напісана?
— Яшчэ б!
Ваўку дазволена
Хадзіць па хатах,





Выпрошваць хлеб
У бедных і багатых.
— Мне граматы другой
Не прыстарацца, знаю,
А без яе зімой
Ад голаду сканаю.
— Дар-руй!..—
Спацеў, аслаб
Збянтэжаны сабака,
І ледзь з-пад воўчых лап
Ён выпаўз, небарака.
Адумаўся:

Самá на мыш напала.
А граматы не вернеш—
Згарэла без агню,
І воўк, гаротнік шэры,
Завыў упершыню.
У лапе кій-падмога
Ды торба на баку,



«З-за кошкі
Такая калатнеча!»—
І на яе ў пакоі
Напаў, сцягнуўшы з печы.
«За што сабака лае?»—
І кошцы крыўдна стала,
Яна ў закýтку, злая,

Аднак да хат дарога
Закáзана ваўку.
Разбегліся сябры—
Чужыя,
Ледзь жывыя.
І воўк з тае пары
Без хлеба ў лесе вые.

## ШЭРЫ ГОСЦЬ

### З народнага

Касіў Сабака сена
Для сваяка Вала,
Трава яму ў калена
Ад лесу да сяла.
Абліўся потам, змогся—
Касіў адзін за трох —
І на пракосе ўлёгся,
Заснуў без задніх ног.
Не з баязліўцаў сла́бых,
А ўскочыў — і дрыжыць:
Прыблудны Воўк у лапах
Касу яго дзяржыць.
І кажа:
— Лес ваш бедны!
Абег з канца ў канец—
Зайцоў няма і следу.
Я з'ем цябе, касец!
— Якраз вяселле сёння
Ў майго гаспадара,—
Сабака ўзвыў спрасоння,—
Дык там — касцей гара,
Дык там — каўбасы, студзень
І піва, Воўча, ёсць.
Ты на вяселлі будзеш
Жаданы самы госць.
— Вядзі!
Прагонім смагу,
Закусім,— кажа Воўк.
І над касцом для страху
Зубамі шчоўк ды шчоўк.
Прывёў Сабака,
Вучыць:
— Пад лаву хвост схавай,
А заспяваюць гучна—
З гасцямі не спявай!..
Ваўка садзіцца просяць,
Падколваюць крыху:
— Спякота!
Сена косяць,
А дзядзька ў кажуху!
— Дзівак!..—
Рагочуць госці,





Кругом вясёлы гуд.
А «дзядзька» моўчкі косці
Грызе, залезшы ў кут.
Паслухаліся свата,
І аж уздрыгнуў дом—
Для маладых дзяўчаты
Запелі за сталом:
— Папросім лесніка,
Каб нам злавіў ваўка,
У лес на ім паедзем—
Па казкі вашым дзецям...
Закуска ў рот не лезе,
А пецъ жаданне ёсць—
І ў хаце, як у лесе,
Завыў ён, шэры госць:
— Засне пастух —
Пайду на луг,
Здзяру кажух
З авечак дзвюх...
Аж анямелі госці
Тут у сваю чаргу:
Дык вось хто любіць косці,
Пацее ў кажуху!
І спевака ляснога

За хвост хутчэй — ды ў круг,
Сілком з яго, жывога,
Хацелі зняць кажух.
Хто ў лоб качалкай перыў,
Хто качаргою тоўк—
І ледзь назад, за дзверы,
Уцёк з вяселля Воўк.
А я вам казку следам
Прынёс з таго сяла,
Дзе сена косіць летам
Сабака для Вала.



## САРОЧЫН ГАСЦІНЕЦ





У дзіцячым садзе
Скачуць птушаняткі —
На хвасце сарока
Прынясла загадкі.
Абяцала з лесу
Прылятаць часцей,
Бо гасцінец гэты
І для вас, дзяцей.



Не ляснік, ды мае
Ў пушчы свой абход,
А з усіх прысмакаў
Надта любіць мёд. *(Мядзведзь)*

Грыбы збірае, сушыць,
Залезшы на яліну,
І лётае, як птушка,
З галіны на галіну. *(Вавёрка)*

Хвароба такая
У птаха ляснога:
Калі заспявае,
Не чуе нічога. *(Глушэц)*

Ён калючы змалку,
Гэты маладзец,
Шмат іголак мае,
Толькі — не кравец. *(Вожык)*

Кошка вялікая,
Ды не мурлыкае —
На звяроў нападае
Драпежніца маладая. *(Рысь)*

Дзе яго сядзіба?
Дзе ён сам цяпер?
Плавае — як рыба,
Бегае — як звер. *(Бабёр)*

На цэлы лес адна
Такія мае вочы:
Сляпая ўдзень яна,
Відушчая — уночы. *(Сава)*

Птушанятак хваліць,
Б'е сарока ў ладкі —
Адгадалі ў садзе
Ўсе яе загадкі.

Не бяда, што мала,
Не бяда, што ўсе,—
На хвасце сарока
Болей прынясе.



## ЗМЕСТ


ДЗЕД І ЎНУЧКА

Юля . . . . . . . . . . 4
Ластаўкі . . . . . . . . 4
Зорка . . . . . . . . . 5
Сняжок . . . . . . . . . 6
Зязюля . . . . . . . . . 7
Курыца-нясушка . . . . . 7
Парасяткі . . . . . . . . 8
Дзе вучыўся дзед . . . . 9
Кот-казачнік . . . . . . 10
Калыханка . . . . . . . 12

САЛОДКІ ЛЯДЗЯШ

Стол . . . . . . . . . . 14
Салодкі лядзяш . . . . . 14
Жаваранак . . . . . . . 15
Гняздзечка . . . . . . . 15
Велагонка . . . . . . . 15
Кацярынка . . . . . . . 16
Дзе начуе ноч . . . . . 16
Падарунак . . . . . . . 17
Прыгода . . . . . . . . 17
Імянінннік . . . . . . . 18
Цялячы садзік . . . . . 18
Ягаднік . . . . . . . . 18
Камары-камарыкі . . . . 19
Пацешка . . . . . . . . 19
Дражнілка . . . . . . . 19
Лічылка . . . . . . . . 20
Прыгавор . . . . . . . . 20
Заклічка . . . . . . . . 20
Скорагаворка . . . . . . 20
Загадка . . . . . . . . 20
Атэлье «Прамень» *(Казка)* 21
Як зайцы з тушканчыкамі ў футбол гулялі *(Казка)* . . 24
Разумная варона *(З народнага)* . . . . . . 26

ЯК ДОМ БУДАВАЛІ
ЗАЙЧЫК СА СКАКАЛКАЙ

Нарач . . . . . . . . . 34
Дзе жывуць казкі . . . . 34
Бульбінка . . . . . . . 34
Боршч з крапівы . . . . 35
Какаду . . . . . . . . . 35
Птушынае малако . . . . 36
Радавы . . . . . . . . . 36
Страх . . . . . . . . . 37
Грыбасей . . . . . . . . 37
Як Жук баравікі збіраў . . 38
Барана на дрэве . . . . . 40
Што за гаспадыня? . . . 40
Каму ў дзяжы цесна? . . . 40
Жар-птушка . . . . . . . 40
Лістапад . . . . . . . . 40
Зайчык са скакалкай . . . 40
Дыяфільм пра мора . . . 41
Казка пра зязюлю *(З народнага)* . . . . . . 45
Воўчая грамата, або Чаму воўк вые *(З народнага)* . . 47
Шэры госць *(З народнага)* 51
Сарочын гасцінец . . . . 53

Литературно-художественное издание

**МАЛЯВКО Николай Александрович**

**ГДЕ ЖИВУТ СКАЗКИ**

**Стихи, сказки**

*Для дошкольного возраста*

Минск, издательство «Юнацтва»
На белорусском языке

Літаратурна-мастацкае выданне

**МАЛЯЎКА Мікалай Аляксандравіч**

**ДЗЕ ЖЫВУЦЬ КАЗКІ**

**Вершы, казкі**

Мастацкі рэдактар *Ю. Ц. Цярэшчанка*

Тэхнічны рэдактар *А. В. Русецкая*

Карэктар *Л. К. Паплаўская*

Здадзена ў набор 29.10.90. Падпісана да друку 17.07.91. Фармат $70 \times 100^{1}/_{16}$. Папера афс. № 2. Гарнітура Школьная. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 4,55. Ум. фарб.-адб. 18,9. Ул.-выд. арк. 5,11. Тыраж 20000 экз. Зак. 683.

Выдавецтва «Юнацтва» Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінская фабрыка каляровага друку. 220115, Мінск, Каржанеўскага, 20. Дыяпазітывы тэксту падрыхтаваны Мінскім ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінатам МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.



«Юнацтва»